Таццяна ПЛАДУНОВА
(г. Мінск)

# РУХОМЫ ФЭСТ «ПА СВЯТАХ «СОНЕЧНАГА КРЫЖА»: САЦЫЯЛЬНЫ ЗАПЫТ І КАНЦЭПЦЫЯ

*Святы сонцаваротаў... – найстаражытныя з каляндарных.. Абраднасць гэтых дзён – гульнёвая, але такая гульчя глыбока сур'ёзна па сваёй сутнасці, скіравана... на тое, каб не спынялася жыццё* [2].

С.Я.Сяроў

Праблема падрыхтоўкі і правядзення фальклорных святаў і фестываляў з улікам дакументальнай асновы мастацкай творчасці – сёння пастаўлена невыпадкова. Яна падсвядома «выспела» ў час шэрагу мерапрыемстваў па этнакультурным выхаванні, якія адбыліся ў Мінску за апошнія пяць год. Першапачаткова гэта былі імпрэзы аддзела народных рамёстваў і фальклору Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. З 2003 года аддзел іх ладзіць сумесна з факультэтам традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва БДУ культуры і мастацтваў.

*Табліца 1*

| | дата | імпрэза | удзельнікі |
|---|---|---|---|
| • | 20.09. 2002г. | Рэспубліканскі "круглы стол" па тэме "Этнакультурнае выхаванне і петні адпачынак дзяцей і падлеткаў" | школьнікі і моладзь Мінскага, Любанскага раёнаў, г. Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі РБ |
| • | 01.04. 2003г. | Рэспубліканскі майстар-клас "Традыцыйны побытавы танец як складальнік этнакультурнага выхавання: досвед фальклорных аб'яднанняў паўночнай і цэнтральнай Беларусі" | школьнікі і моладзь Расонскага, Любанскага, Мінскага раёнаў, г.Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі РБ |
| • | 08-09.10. 2003г. | Рэспубліканскі майстар-клас "Рэспубліканскі эксперыментальны праект "Танцавальны фальклор #дзеці" – эфектыўная адкрытая сістэма этнакультурнага выхавання" | школьнікі і моладзь Любанскага, Барысаўскага, Мінскага раёнаў, г.Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі РБ |
| • | 14-15.04. 2004г. | Рэспубліканскі "круглы стол" па тэме "Святы "Сонечнага крыжа" і сістэмнасць працэсу этнакультурнага выхавання дзяцей і падлеткаў" | школьнікі і моладзь Любанскага, Драгічынскага, Акцябрскага раёнаў, г.Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі РБ |
| • | 27-28.10. 2004г. | Рэспубліканскі майстар-клас "Пераемнасць беларускай этнафанічнай традыцыі: тэорыя і практыка" | школьнікі і моладзь Валожынскага, Лепельскага, Мінскага раёнаў, г.Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі РБ |
| • | 30-31.03. 2005г. | Рэспубліканскі "круглы стол" па тэме "Адаптацыя традыцыйнага строя ў дзіцячым і маладзёжным фальклорным гурце" | школьнікі і моладзь Любанскага, Барысаўскага, Мінскага раёнаў, г.Мінска, супрацоўнікі ўстаноў культуры і адукацыі РБ |
| | 16-17.11. 2005г. | Рэспубліканскі майстар-клас "Інструментальная этнафонія беларусаў: месца ў адукацыйнай і культурнай прасторы XXI стагоддзя" | школьнікі і моладзь Драгічынскага, Акцябрскага, Мінскага раёнаў, гарадоў Мінска, Рыгі, супрацоўнікі ўстаноў культурыры і адукацыі РБ |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кожная з сустрэч была трыбунай для абмеркавання нейкага аспекта сістэмы этнакультурнага выхавання ў краіне; сістэмы, якая складалася адвольна і, часам, даволі паспяхова. Але абмяркоўваць заўсёды было што. Напрыклад, майстар-класы, прысвечаныя спевам... Які эталон спеўнага гуку – наш, беларускі? Які этнафанічны эталон Брэсцкага, Гомельскага Палесся, Падзвіння? У 2005 годзе апошні майстар-клас быў прысвечаны інструментальнай этнафоніі. Наш эталон інструментальнага гуку, што гэта: гучанне баяна, гусляў і цымбал, альбо дуды? Што кажуць дакументы? Неаднаразова ставілася пытанне, які зараз эталон правядзення фесталяў і святаў, прысвечаных фальклорнай і гістарычнай тэматыцы? Якая тут будзе функцыя – забаўляльная, пацяшальная, эстэтычная, асветніцкая, інтэлектуальная? Альбо варта нейкім чынам захоўваць ў балансе ўсе вышэйпералічаныя функцыі? Безумоўна найважнейшае для фальклору, этнакультурнага выхавання – адпаведнасць прадмета навучання часу і пэўнаму рэгіёну.

Сёння гэтая «чырвоная нітка» – геаграфічна-тэмпаральная адпаведнасць – суперактуальна для адраджэння фальклору. Зыходзячы з таго, што мы слухаем, спяваем, танчым, можна меркаваць, чые мы нашчадкі – кельтаў, славянаў, балтаў? Якую культуру нам прапагандаваць, з якой культурай нам сябе ідэнтыфікаваць? Фальклор – гэта вялікая плынь мастацтва, спецыфічны яго від. Мне давялося адчуць у Летуве, што фальклор – гэта менавіта *жывое* мастацтва, гэта камунікацыя... Калі гучыць фальклорная песня, ты ў любы момант можаш далучыцца да яе... У той жа час, сёння гэта элітарнае мастацтва. Яго не ведаюць, бо тэле- і радыёэфір, музычныя крамы, вучэбныя школьныя праграмы і планы ВНУ захопленыя іншай музыкай. У Летуве і Латвіі кожны чацвер і аўторак фальклорны гурт па чарзе наведвае пэўную карчму, выконвае праграму з інтэрактыўным, хэпінінгавым складальнікам. Тут акрамя папулярызацыі фальклору ёсць камунікатыўны момант. Да гэтых калектываў могуць далучацца новыя ўдзельнікі. Гурты на такіх канцэртах пашыраюцца на час выканання праграмы.



У аддзеле народных рамёстваў і фальклору мы спрабавалі выбудаваць *канцэпцыю сістэмнага далучэння гарадской моладзі і дзяцей да каштоўнасцей традыцыйнай культуры праз* т.зв. *святы "Сонечнага крыжа"*. Аснова фальклору беларусаў – каляндарна-абрадавая творчасць – тое, што ўпісвае чалавека ў прыродны асяродак, тое, што звязана з бытаваннем чалавека на зямлі. Святы "Сонечнага крыжа" – чатыры галоўныя астранамічныя кропкі ў годзе: веснавое раўнадзенства (Дабравешчанне і Вялікдзень), летні сонцаварот (Купалле), восеньскае раўнадзенства (Багач і Дзяды), зімовы сонцаварот (Каляды). Да гэтых датаў былі здаўна прымеркаваны найбуйныя святы Беларусі. Праз адпраўленне асноўных элементаў іх святочна-абрадавага комплексу мы намагаемся абудзіць наступны момант самаадчування: «Я знаходжуся нібыта ў XXI стагоддзі, аднак, у хранатопе свята, нібыта 20, 10, 5 стагоддзяў таму».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ён (хранатоп) стварае моцную энергетычную атмасферу падключэння чалавека да гісторыі свайго народа, сваёй этнічнай традыцыі, гульні. Знаёміць з імі «фізіялагічна» праз спевы, танец. Першай прыступкай да гэтага быў праект «Па Крывіі без баяна» (2001-2005гг.), на якім праз этнічныя дыскатэкі, «разбаўленыя» абрадавымі спевамі, з абавязковым прымеркаваннем да святаў «Сонечнага крыжа» пост-фальклорныя гурты «Ветах» і «Верас» імкнуліся запоўніць інфармацыйны вакуум адносна традыцыйнай культуры ў свядомасці беларускай моладзі. Тут неацэнную дапамогу нам аказалі Мікола Козенка (ўзорамі побытавых танцаў), Алена Дзмітрыева (інфармацыйна), Алесь Міхалевіч (арганізацыйна), шэраг удзельнікаў фальклорнага руху Беларусі.



Сапраўды, калі ў працэсе пяцікратнай падрыхтоўкі да 4-х разовых на год імпрэзаў «Па Крывіі...» мы даследвалі наш багаты каляндар, то прыйшлі да высновы, што ў нас яскрава і прыгожа святкуюць у кожным рэгіёне і Каляды, і Гуканне вясны, паўсюль па-рознаму... Аднак, заўсёды прысутнічае тэндэнцыя – чалавек у час свята цягнецца на прыроду, не можа сядзець спакойна ў зачыненым урбаністычным цэментовым паралелаграме (сучасныя дыскаклубы, канцэртныя залы – пляцоўкі «Па Крывіі... »). Свой асобны, «плэнэрна-натуралістычны» код у рэгіёнах маюць усе святы: Вялікдзень – свята вялікага абуджэння прыроды, вечар «калектыўнай дамовы» вясковай супольнасці годна, як след пражыць яшчэ адзін год-цыкл; Купалле – ноч яднання прыроды і чалавека, ноч, якую варта прыгожа бавіць не ў адзіноце; Багач – дзень падвядзення гаспадарчых вынікаў, хмельное свята заможнасці для працавітых; Каляды – ноч шумнага развітання з састарэлым і непатрэбным, адпрацаваным у бойках будзённасці, ноч, якая нясе надзею на непарыўнасць жыцця ў прадчуванні новага гадавога абарота прыроды.

Разуменне патрэбы «выйсці на зямлю» павольна ператварылася ў праект «Рухомы фэст па святах «Сонечнага крыжа». Канцэпцыя нашага праекта – знаёмства беларусаў з розных рэгіёнаў з уласнымі традыцыямі пражывання поўнага свята і азнаямлення з ім іншых. У мінчукоў тут больш дасканалы вопыт, чым у рэгіёнах... Напрыклад, шэраг мінскіх фальклорных гуртоў па кніжках аднаўлялі традыцыю Купалля, Калядаў і ў 1970-80-я гг., святкавалі гэтыя святы.

Пробным камянём «Рухомага фэсту...» быў «Калядны фэст» 2005 года ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі і Гарадскім парку імя Горкага. У свяце бралі ўдзел 5 мінскіх раённых гуртоў і 4 рэгіянальныя. Увогуле было задзейнічана каля 100 удзельнікаў і каля 300 гледачоў фестывальных імпрэзаў. Цікавы быў сам момант, калі мы «аб'ядноўваліся» праз голас, праз танцы...

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Усім гуртам-удзельнікам быў папярэдне прапанаваны «пакет» песень і танцаў. Мы вучылі танцы з мінскай моладдзю, навучалі нас удзельнікі фестывальнага праекту «Берагіня» (яшчэ раз варта падзякаваць яго заснавальніку Міколу Козенку), якіх мы запрасілі. У працэсе імпрэз была дасягнута ключавая ідэя нашага рухомага фэсту – яднанне гледачоў і ўдзельнікаў свята. Фэст шырока асвятляўся ў рэспубліканскіх СМІ. Некаторыя гурты былі далучаны да фальклорнага руху ўпершыню.

Фестываль, які «рушыў у 2007 год» («Веснавы фэст» плануецца ў наступным годзе), будзе прысвечаны веснавому цыклу беларускага календара: «Гуканне вясны»/«Вялікдзень» (у залежнасці ад рэгіёну); другі этап – «Юр'я»; трэці – «Сёмуха»/«Куст»/«Страла» (у залежнасці ад рэгіёну, дзе жывуць удзельнікі). Нейкі гурт можа ўдзельнічаць ва ўсіх трох праграмах-прыступках фэсту. Але гэта будзе не ў плане намінацый, не ў плане ўзнагарод. Мэта – пражыць разам тры дні вясны, напрыклад, «Гуканне вясны», «Юр'я», «Троіца». Спачатку плануецца сакральная частка (абрады), а потым частка прэзентацый фальклорных калектываў (гульні, танцы).

У 2006 годзе мы святкавалі Юр'я з мінскімі гуртамі. Вядома, мы не вывелі на вуліцы статкі жывёлаў – абмежаваліся некалькімі конямі; але здолелі даць увасобленую карціну таго, што Юр'я – гэта свята абуджэння прыроды, пачатку яе сезону плоднасці. Ва урбаністычных умовах не проста адсачыць падтэкст дакументальнай асновы гэтага свята. Таму мы тлумачым дзецям значэнне песень і абрадаў свята. Дзеці знаёмяцца з юраўскім фальклорам. Ім тлумачыцца, для чаго прызначаны песні абыходныя, вітальныя, песні выгану, гульнёвыя песні пастухоўскай бяседы – "Юраўскай яешні". Падчас свята спяваюць гурты розных рэгіёнаў. Яны выконваюць розныя песні, таму што, напрыклад, на Міншчыне, фактычна, сышліся традыцыі некальніх рэгіёнаў. На жаль, у нас няма гурта, які прыехаў бы да нас і паказаў нам на 100 % аўтэнтычнае Юр'я. Увогуле, пытанне «дзе сёння лягчэй праводзіць фальклорае свята – у горадзе, ці на вёсцы?» - актуальна. Ёсць розныя погляды. Нехта кажа, што лягчэй у горадзе, нехта кажа - на вёсцы... Тут трэба памятаць, што зараз тон і моду на паводзіны задае горад, і моладзь урбаністычных асяродкаў ні ў якім разе не трэба губляць з фальклорнага руху. Як вядома, ва ўмовах двухмоўя, бікультурнасці «верх бярэ – не канчаткова, а часова – тая сфера культуры і цывілізацыі і той грамадска-палітычны лад, якія па розных прычынах падаюцца мясцоваму насельніцтву найбольш прывабнымі і рэальнымі» [3]. Тут дамінуючы момант – момант паважлівага падыходу, дыялогу.` Нават досвед фестывалю «Берагіня» падкрэслівае, што этнакультурнае выхаванне ў XXI стагоддзі – не музей фальклору, а яго жывы працяг. Пры ўсіх хібах пост-фальклорнага падыходу, які мы прапануем, надзея на тое, што гарадскія пост-фальклорныя формы (тыя з іх, што сапраўды генетычна звязаныя з традыцыяй) мусяць стымуляваць і існаванне ўласна традыцыі на месцах, апраўдана і абгрунтавана фанталогіяй фальклорнага руху ў Прыбалтыцы і Расіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Нягледзячы на «лёгкі» кантэкст, пытанне святаў – дзяржаўнае. На якіх з іх духоўна яднаецца народ? Безумоўна, важная дата – 9 траўня, але ёсць і святы хараства прыроды і народных традыцый, што існуюць тысячагоддзямі! Балты нездарма зрабілі акцэнт на Rasa і Ligo – аналагі «Купалля»[1]. Яго святкуем і мы, але часцяком свята ладзяць, але ўдзельнікі не ведаюць, што рабіць на ім! Шанец яшчэ раз падумаць пра гэта – ўдзел у «Рухомым фэсце...», да якога мы будзем запрашаць прадстаўнікоў працэсу этнакультурнага выхавання ў бліжэйшыя 5 год. Абавязак спецыялістаў: азнаёміць з паводзінамі, прынятымі ў час святаў. Астатняе на сябе «возьмуць» прырода і генетыка ўдзельнікаў, бо патрэба ў святе – невынішчальная; а ў беларусаў у падсвядомасці захавана патрэба менавіта ў беларускім святе.



Напрыканцы варта зрабіць наступныя высновы.

- Сітуацыя з фальклорным рухам на Беларусі вымагае ў XXI стагоддзі стварэння сістэмы камунікацыі і інфармацыйна-эмацыянальнага абмену паміж яго ўдзельнікамі.
- Апошнім часам акрэслілася тэндэнцыя руралізацыі гарадскіх фальклорных імпрэзаў – пераносу іх з сцэнічных пляцовак на прыроду – ў натуральны ландшафт, дзе яны і павінны адбывацца.
- Бліжэйшы час абяцае, што мы станем сведкамі існавання фестывальных праектаў, якія палепшаць сітуацыю з постфальклорнымі беларускімі гуртамі ў накірунку адпаведнасці ўсходнееўрапейскім формам.

**Літаратура**


1. Калацэй, В.В. Ля вытокаў культуры. Міфалогія Беларусі : досвед структурнага аналізу / В.В.Калацэй // Культурная спадчына : культуралаг.-сацыялагіч. даследаванні / укл. Э.Дарашэвіч. – Мінск : Сучаснае слова, 2001. – С.42.
2. Серов, С.Я. Календарный праздник и его место в европейской народной культуре / С.Я.Серов // Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы : историч. корни и развитие обычаев. – М. : Наука, 1983. – С. 39 – 55.
3. Хлебовчик, Ю. Роль и функции двуязычия в процессе образования наций / Ю.Хлебовчик // Формирование наций в Центральной и Юго-Восточной Европе. – М. : Наука, 1981. – С. 103.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ